Падтрымай "Вясну" на PATREON

Суд аштрафаваў двух удзельнікаў Дня памяці паўстанцаў у Свіслачы

16.11.2018 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



Дзень памяці паўстанцаў 1863-64 гг. у Свіслачы.

Сталі вядомы вынікі першых адміністрацыйных працэсаў супраць удзельнікаў традыцыйнага Дня памяці паўстанцаў 1863 году, які прайшоў 27 кастрычніка ў Свіслачы і Якушоўцы, паведамляе **"Гарадзенская Вясна".**

15 лістапада старшыня Свіслацкага раённага суду **Аляксандр Шылін** засудзіў грамадскага актывіста **Юрыя Глебіка** паводле артыкуу 23.34, частка 1 да **25** базавых велічынь штрафу. Ён жа 16 лістапада аштрафаваў іншага грамадскага актывіста **Віктара Пяцельчыца** да **10** базавых штрафу.

Старшыня Свіслацкага суду Аляксандр Шылін мае багаты досвед карных пастановаў - у ранейшыя гады – у 2012-ым, 2014-ым, 2015-ым і 2016-ым гадах ужо засуджваў грамадскіх актывістаў да адміністрацыйнага арышту і штрафаў за ўдзел у традыцыйным Дні памяці паўстанцаў.

Даты судоў у дачыненні да гарадзенскіх праваабаронцаў і грамадскіх актывістаў яшчэ невядомыя. **Віктар Сазонаў**, **Уладзімір Хільмановіч** і **Ежы Грыгенча** ўжо азнаёміліся з складзенымі на іх пратаколамі пра нібыта адміністрацыйныя правапарушэнні. Таксама аналагічныя пратаколы складзены

на **Мікалая Саляніка**, **Сяргея Верамеенку** і **Ігара Банцара**.

Твитнуть









ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

"Я, напэўна, проста памру тут": хто з палітвязняў знаходзіцца ў асаблівай рызыцы за кратамі



#ВолюВясне





ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

"Бяляцкі, прасі літасці!" У Швецыі прадставяць спектакль-чытку паводле твораў Бяляцкага і Знака

Валерыя Цапкалу завочна асудзілі да 17 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму (дапоўнена)

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY